Такім чынам, асновай карціны свету ў мастацкай сістэме У. Сцяпана і А. Хамдама выступаюць сям'я і ідэя аб важнасці прадаўжэння роду як знаку яго ўстойлівасці і моцы. Нягледзячы на тое, што дадзеныя паняцці падвяргаюцца выпрабаванню ў навелістычнай прасторы абодвух аўтараў, матыў даравання спрыяе гарманізацыі і дазваляе канстатаваць перавагу сямейных каштоўнасцей і трываласць родавага дрэва. Пэўная фатальнасць лёсу, бясспрэчна, уплывае на светабачанне герояў і працэс мадэлявання карціны свету. Аднак устойліва сфарміраваная аксіялагічная сістэма і актыўная пазіцыя персанажаў у працэсе ўласнага лёсавызначэння ў значнай ступені нівеліруюць ідэю непазбежнай наканаванасці. Адмоўныя прыкметы і падзеі, становячыся часткай рэчаіснасці, праз прызму іроніі і дзякуючы матыву расплаты, набываюць функцыю фону для ўдасканальвання і крышталізацыі канструктыўных складнікаў, што, пры выразнай поліфанічнасці, абмоўлівае сістэмны характар карціны свету.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Кавалёва, Р. М.* Жанравы код фальклорнай карціны свету : Няказкавая проза. Дзіцячы фальклор. Загадкі. Казкі / Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава. – Мінск : Белпрынт, 2012. – 122 с.
2. *Сцяпан, У.* Адна капейка : кніга прозы / Уладзімір Сцяпан. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – 224 с.
3. *Хамдам, А.* Жыццё не спыняецца : апавяданні / А. Хамдам. – Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2013. – 176 с.



**К. А. Ермаковіч (Мінск)**


# МЕТАДЫЧНЫЯ СРОДКІ ФАРМІРАВАННЯ КАШТОЎНАСНА-СВЕТАПОГЛЯДНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ X–XI КЛАСАЎ У СУЧАСНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Падручнік па беларускай літаратуры ў сучасным адукацыйным літаратурным працэсе выступае асноўным складнікам вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У якасці вучэбна-метадычнага комплексу неабходна разумець навучальную сістэму комплекснага прызначэння, якая ўяўляе сабой сукупнасць лагічна ўзаемазвязаных паміж сабой дыдактычных кампанентаў для забеспячэння неперарыўнасці і паўнаты ўсяго цыкла навучання беларускай літаратуры ў школе [1, с. 438]. Сучасная педагагічная навука паводле функцый вучэбна-метадычнага комплексу вылучае яго асноўны (нарматыўныя дакументы ў галіне адукацыі, вучэбная праграма, тэматычны план, каляндарна-тэматычнае планаванне, план-канспект урока, падручнік, падручнік-хрэстаматыя, вучэбны дапаможнік, хрэстаматыя для пазакласнага чытання, вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўніка, мультымедыйныя

сродкі, да якіх адносяцца электронны падручнік, электронны даведнік, электронны практыкум, тэставая камп'ютарная праграма і інш.) і дадатковы (каляндарна-тэматычнае планаванне, дыдактычныя матэрыялы для вучня, літаратуразнаўчыя слоўнікі, кнігі, выдадзеныя ў серыі «Школьная бібліятэка», выстаўкі-альбомы, прысвечаныя жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, альбомы ілюстрацый, сродкі нагляднасці, аўдыёвізуальныя сродкі навучання, электронныя сродкі навучання, зборнікі тэставых заданняў і інш.) кампаненты. Задачай асноўнага кампанента з'яўляецца забеспячэнне засваення вучнямі вызначанага адукацыйным стандартам абавязковага мінімуму зместу ведаў, уменняў і навыкаў па прадмеце. Дадатковы кампанент вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры выконвае дапаможную функцыю, накіраваную на забеспячэнне дыферэнцыраванага падыходу да навучання, на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей вучняў і эфектыўную вучэбна-метадычную дзейнасць настаўніка. Ва ўмовах аксіялагізацыі літаратурнага навучання выкарыстанне вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай літаратуры адыгрывае выключнае значэнне. Як адзначаюць даследчыкі, ядром вучэбна-метадычнага комплексу выступае падручнік, які разглядаецца не як асобная, ізаляваная адзінка, а як галоўнае звяно метадычнай сістэмы. Акрамя таго падручнік разглядаецца як інавацыйная мадэль навучання, якая дапамагае забяспечыць выкладанне прадмета «Беларуская літаратура», рэалізаваць асобасна арыентаваны падыход у літаратурнай адукацыі [1, с. 439].

Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры для X–XI класаў адносяцца да падручнікаў гісторыка-літаратурнага тыпу і прызначаны для аглядавага і манаграфічнага вывучэння твораў. Прапанаваныя артыкулы для вывучэння твораў ваеннай тэматыкі ў названых вучэбных дапаможніках адлюстроўваюць асноўныя звесткі пра гістарычны і літаратурны працэс, асноўныя біяграфічныя дадзеныя пра пісьменніка, падаюць тэкстуальны аналіз твораў, вылучаных вучэбнай праграмай у спісах для чытання і вывучэння, для дадатковага чытання. Адначасова ў прадстаўленых падручніках уключаецца матэрыял па тэорыі літаратуры. Аднак па прадстаўленых звестках не заўсёды можна вылучыць аксіялагічныя дамінанты, вызначыць жыццёвыя прыярытэты грамадства праз жыццёвы шлях пісьменніка, праз сістэму вобразаў, паказаную ў творах ваеннай тэматыкі.

Існуе шэраг патрабаванняў да канцэптуальных асноў пабудовы вучэбнага дапаможніка. Асноўным з іх навукоўцы адзначаюць адпаведнасць прынцыпам дыдактыкі, г.зн. што матэрыял павінен выкладацца з арыентацыяй на дасягненні сучаснай навукі (прынцып навуковасці); неабходны ўлік узроставых асаблівасцей вучняў, наяўнасць дадатковых тлумачальных тэкстаў, дыферэнцыраваных заданняў (прынцып даступнасці); ажыццяўленне ўзаемасувязі вучэбнага дапаможніка з нагляднымі матэрыяламі, наяўнасць ілюстрацыйнага матэрыялу (прынцып нагляднасці); паслядоўнае выкладанне матэрыялу ад простага да больш складанага, падзел падручніка на раздзелы, тэмы (прынцып сістэмнасці); наяўнасць тэарэтычных і практыка арыентаваных пытанняў і заданняў (прынцып сувязі тэорыі з практыкай).

З мэтай вызначэння ўзроўню даступнасці, лёгкасці ўспрымання матэрыялу, яго падачы ў падручніку, а таксама магчымасці самастойнай працы вучняў, падрыхтоўкі да ўрокаў (у першую чаргу нетрадыцыйных, дзе значная роля адведзена ўрокам-канферэнцыям, урокам-дыспутам) сярод вучняў X–XI класаў было праведзена апытанне.

На першае пытанне анкеты *«У якім падручніку найбольш зразумела і даступна пададзены вучэбны матэрыял?»* 56 % рэспандэнтаў назвалі падручнік па беларускай літаратуры, што сведчыць пра адносную даступнасць выкладу матэрыялу. Адзначым, што прапанаваная ў падручніку сістэма пытанняў і заданняў не выклікае ў вучняў цяжкасцей, успрымаецца як неабходны элемент для засваення матэрыялу. На гэта ўказваюць адказы на другое пытанне *«Выкананне заданняў якога падручніка выклікае ў вас найбольшыя цяжкасці?»*, дзе падручнік па беларускай літаратуры ўвогуле не згадваецца. На думку рэспандэнтаў, цяжкасці падчас працы з падручнікам усё ж узнікаюць. Адказы на пытанне *«Што, на ваш погляд, можа выклікаць цяжкасці ў працы з падручнікам?»* адлюструем у выглядзе дыяграмы (малюнак):




Прычыны цяжкасцей у працы з падручнікам

У працэсе вывучэння вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры значная ўвага надавалася наяўнасці асаблівасцей аксіялагічнага (у прыватнасці, уліку прынцыпаў аксіялагічнай дамінанты, часавай далучанасці) і біяграфічнага падыходаў.

Метадычны апарат падручніка скіраваны на тое, каб дапамагчы творчаму і самастойнаму засваенню твора кожным вучнем. Адной з функцый падручніка з'яўляецца стварэнне ў вучняў уяўлення аб узроўні сучаснай навукі. У гэтых адносінах тыпалагічныя характарыстыкі школьных падручнікаў адрозныя.

Як паказвае аналіз педагагічнай літаратуры, неаднаразова ўзнікалі праблемы пабудовы падручніка, звязаныя з канструяваннем яго зместу (у адпаведнасці з прынцыпам навуковасці), з магчымасцямі ідэйна-выхаваўчага патэнцыялу, а таксама з метадычным забеспячэннем вучэбнага дапаможніка. Адзначым, што вышэй пералічаныя пытанні разглядаліся ў працах Н. Н. Баранскага, Ф. П. Кароўкіна, Д. Д. Зуева, А. В. Пёрышкіна, М. Н. Скаткіна, Н. М. Шанскага і іншых вучоных.

Сучасны падручнік па літаратуры для вучняў X–XI класаў разглядаецца не столькі як дапаможнік для дамашняй работы па замацаванні матэрыялу, колькі арыентуе на самастойнае вывучэнне пытанняў вучэбнага прадмета, на пошук новых ведаў, іх сістэматызацыю і абагульненне. Такая асаблівасць падручніка спрыяе самастойнаму вызначэнню вучнямі асноўных звестак пра жыццёвы і творчы шлях нісьменніка, індывідуальнаму вылучэнню аксіялагічных дамінант грамадства ў пэўны перыяд праз сістэму вобразаў, увасобленых у творах ваеннай тэматыкі.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі павінна фарміравацца не канстатацыя-набор ведаў і ўменняў, а іх вызначаная, навукова абгрунтаваная сістэма. Адным з важнейшых патрабаванняў да стварэння такой сістэмы з’яўляецца ўлік узроставых асаблівасцей вучняў, а таксама спецыфікі вывучаемых у школе прадметаў.

Аналіз сучасных падручнікаў сведчыць, што працэсу фарміравання каштоўнаснага светапогляду вучняў адводзіцца нязначнае месца.

Метадычная паслядоўнасць у працэсе фарміравання светапоглядных высноў і паняццяў – яшчэ адно патрабаванне. Для яго рэалізацыі неабходна распрацаваць схемы раскрыцця асноўных паняццяў, дзе б даваўся адказ на наступныя пытанні:

1) Якія веды, неабходныя для засваення гісторыка-тэарэтычных паняццяў па літаратуры, атрымаліваюць вучні падчас працы з прапанаванымі вучэбнымі дапаможнікамі?

2) На якім эмпірычным матэрыяле будзе канкрэтызавацца пэўнае паняцце ў падручніку?

3) Якія новыя для вучняў паняцці будуць раскрыты, іх асаблівасці і сувязі з другімі паняццямі?

4) Пры выкладанні якой тэмы і ў якой фармулёўцы мэтазгодна даць вызначэнне паняцця (калі гэта неабходна)?

5) Як будзе забяспечана ў падручніку навучанне вучняў уменню аперыраваць паняццем у працэсе іх вучэбна-пазнавальнай дзейнасці?

Вырашэнне пастаўленых пытанняў абапіралася на асаблівасці рэалізацыі аксіялагічнага падыходу ў навучанні беларускай літаратуры.

Сучасны літаратурны адукацыйны працэс характарызуецца скіраванасцю на фарміраванне і выхаванне гарманічна і ўсебакова развітай асобы, здольнай да адаптацыі ў сацыякультурным, інфармацыйным грамадстве. Выхаднымі пры аналізе метадычных сродкаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў у сучасных дапаможніках па беларускай літаратуры сталі абгрунтаваныя ў даследаванні аксіялагічны і біяграфічны падыходы.

Рэалізацыя аксіялагічнага падыходу да фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі пры вывучэнні твораў ваеннай тэматыкі ў літаратурным адукацыйным працэсе патрабуе дакладнага вызначэння дыдактыка-метадычных мэт, дапаможных матывацыйных і змястоўных прынцыпаў. У сувязі з гэтым адной з важных перадумоў, якая дапамагае забяспечыць якаснае выкананне пастаўленай задачы, з'яўляецца грунтоўнае вывучэнне і аналіз вучэбных праграм па прадмеце «Беларуская літаратура», вучэбных дапаможнікаў і дыдактычных матэрыялаў для забеспячэння адукацыйнага працэсу ў X–XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Пры аналізе сучасных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура», улічваючы прынцыпы аксіялагічнай дамінанты і часавай далучанасці, была сканцэнтравана ўвага на наступных асаблівасцях:

- зарыентаванасць праграмы для X–XI класаў на вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі (г.зн. на колькасны паказчык названых твораў ад агульнага аб'ёму вывучаемых мастацкіх тэкстаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі);
- прадстаўленасць у праграмах такіх твораў ваеннай тэматыкі, у якіх акцэнт робіцца на агульначалавечыя каштоўнасці і вечныя ісціны, увасобленыя ў вобразах галоўных герояў;
- накіраванасць праграм на фарміраванне ў вучняў каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі, на выпрацоўку індывідуальнай сістэмы каштоўнасцей, на стварэнне ўмоў для інтэрыярызацыі каштоўнасных арыентацый грамадства ва ўласныя.

Вучэбнай праграмай прадугледжана, што вучні знаёмяцца з мастацкімі творамі на тэму вайны на працягу ўсяго навучання, аднак больш дэталёвы аналіз і ваеннага, і пасляваеннага перыяду ў грамадстве і ў мастацтве слова адбываецца на III ступені навучання.

Адным з важных пытанняў вывучэння твораў ваеннай тэматыкі бачыцца праблема «несупадзення ў часе». Успрыняцце падзей вайны сучаснікам вельмі адрозніваецца ад таго чытача, «пасляваеннага», ад чытача-дзіцяці вайны. Для сённяшняга маладога пакалення вайна іншая, далёкая.

Каштоўнасна-светапоглядная кампетэнцыя прадугледжвае фарміраванне ў вучняў сродкамі беларускай літаратуры сістэмы духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, гуманістычнага погляду на свет; гатоўнасць асобы да самапазнання, самаўдасканалення і самавызначэння; здольнасць бачыць і разумець навакольны свет, арыентавацца ў ім, усведамляць сваю ролю і прызначэнне, умець выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, прымаць рашэнні.

Аналіз вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для X–XI класаў праводзіўся з улікам такіх асаблівасцей, як здольнасць садзейнічаць фарміраванню каштоўнасных арыенціраў вучняў у працэсе вывучэння твораў ваеннай тэматыкі, развіццю творчых навыкаў вучняў, уменняў самастойна ацэньваць нестандартныя сітуацыі, характары, абгрунтоўваць меркаванні,

даваць якасную ацэнку-характарыстыку персанажам, вызначаць асноўныя каштоўнасці для герояў твора і імкнуцца да іх інтэрыярызацыі, г.зн. магчымасці фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі з дапамогай падручнікаў. Таму характарыстыка дапаможнікаў уключала: тэарэтычны аналіз манаграфічных і аглядавых артыкулаў пра літаратуру ваеннай тэматыкі і заданняў да іх з улікам іх непасрэднага дачынення да фарміравання каштоўнасных арыентацый вучняў.

Дыдактычную накіраванасць падручнікаў на вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі як аднаго са складнікаў фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі мэтазгодна адлюстраваць у наступных блоках, якія адпавядаюць складаемым каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі.

Блок 1. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на фарміраванне літара-туразнаўчых ведаў, уменняў і навыкаў:

- арыентацыя на засваенне асаблівасцей асноўных пытанняў тэорыі і гісторыі літаратуры;
- уменні суадносіць набытыя тэарэтычныя звесткі з асаблівасцямі іх практычнага ўвасаблення падчас аналізу мастацкага твора.

Блок 2. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на ўдасканаленне аналі-тычных ведаў, уменняў і навыкаў:

- арыентацыя на засваенне маральных эталонаў дабра і справядлівасці як духоўных ідэалаў народа;
- фарміраванне нацыянальнай годнасці і патрыятызму.

Блок 3. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на фарміраванне пачуц-цёва-творчых ведаў, уменняў і навыкаў:

- фарміраванне пачуцця суперажывання герою;
- развіццё пазіцыі «я»-вучня;
- развіццё навыкаў успрымання каштоўнасцей грамадства, пераносу іх на сваю сістэму каштоўнасцей (працэс інтэрыярызацыі);
- фарміраванне ўмення выказваць уласны пункт погляду на праблему.

Скіраванасць школьных падручнікаў і дыдактычных матэрыялаў на выкарыстанне твораў ваеннай тэматыкі ў працэсе фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі патрабуе ўдакладнення заданняў і практы-каванняў, пашырэння тэарэтычнага дыяпазону ведаў вучняў, увядзення такіх паняццяў, як светапогляд, самавызначэнне, каштоўнасная сістэма поглядаў герояў твора.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Бельский, А. И.* Учебно-методический комплекс по белорусской литературе / А. И. Бельский // Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. – Минск, 2015. – Т. 2. – С. 438–440.